Імёны і падзеі ў датах

# ЦЭНТР НАВУКОВАЙ ДУМКІ



**_Г.У.Карзенка,_**
**_доктар гістарычных навук, загадчык аддзела гісторыі навукі інстытута гісторыі НАН Беларусі_**

**_30 студзеня 1922 г. на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР быў заснаваны шматгаліновы Інстытут беларускай культуры, дзейнасць якога пакінула глыбокі след у гісторыі нашай краіны. Інбелкульт з'явіўся ініцыятарам і выканаўцам многіх праектаў па нацыянальным адраджэнні, выступіў рухавіком эканамічнага і духоўнага прагрэсу беларускага народа._**

З таго часу прайшло 80 гадоў...

Юбілей — гэта заўсёды рэтраспектыўны погляд на пройдзены шлях, ацэнка здзейсненага. У 20-ыя гг. XX ст. развіццё навукі і адукацыі ў БССР ажыццяўлялася хуткімі для таго часу тэмпамі. Ва ўмовах страшэнных разбурэнняў першай сусветнай і грамадзянскай войнаў урад рэспублікі прыняў шэраг канкрэтных мер па ліквідацыі непісьменнасці, адкрыцці вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, стварэнні навуковых цэнтраў. У 1919 г. быў адноўлены Горы-Горацкі земляробчы інстытут (з 1925 г. Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія), у 1920 г. пачаў працаваць Беларускі політэхнічны інстытут, у 1921 г. створаны Віцебскі санітарна-бактэрыялагічны інстытут. Вялікай падзеяй з'явілася адкрыццё ў Мінску 30 кастрычніка 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тым самым закладваліся асновы для далейшага росту навуковага патэнцыялу краіны.

Жыццё патрабавала значных фундаментальных распрацовак, накіраваных на пераадоленне тэхніка-эканамічнага адставання, вырашэнне шырокага спектра рэгіянальных праблем. Паскоранае развіццё навукі разглядалася як галоўны элемент дзяржаўнай палітыкі па змене сацыяльнага аблічча Беларусі, ператварэнні яе ў рэспубліку з высокім узроўнем культуры і эканомікі. З гэтай мэтай і быў створаны Інбелкульт, якому даручалася правядзенне даследаванняў мовы, літаратуры, побыту народа і яго гісторыі, прыроды, эканомікі, сацыяльна-грамадскага развіцця. Яго структура ўключала гуманітарную (камісіі слоўнікавая, тэрміналагічная, літаратурна-даследчая) і прыродазнаўчую секцыі. У першы склад цэнтра навуковай думкі ўваходзілі старшыня С.Некрашэвіч, вучоны сакратар У.Чаржынскі, правадзейныя члены К.Міцкевіч (Я.Колас), І.Лёсік, навуковыя супрацоўнікі М.Гуткоўскі, С.Бурак, А.Круталевіч, В.Міхальскі, М.Піятуховіч, С.Плаўнік (Змітрок Бядуля) і інш. У распрацоўцы статута бралі ўдзел выдатныя вучоныя філолаг і этнограф Я.Карскі, гісторык У.Пічэта, мастацтвазнаўца Я.Дыла.

*...Думка аб залажэнні Інстытуту Беларускай Культуры зарадзілася ў беларускім грамадстве ўжо даўно. Блізка году таму назад на сходзе беларускага грамадзянства С.Некрашэвічам быў прачытаны на гэту тэму даклад, у рэзультаце якога была выбрана камісія для распрацавання статуту Інбелкульту. Апрацаваны гэтай камісіяй пад старшынством З.Жылуновіча праект статуту адводзіў толькі шырокае месца культурна-грамадзянскім пытанням, надаючы такім чынам Інстытуту характар больш грамадзянскай, чым навукова-даследчай установы. Аднначасова з працаваннем камісіяй статуту ў Мінску Праўленне Беларускага Дзяржаўнага Універсітэту ў асобе яго рэктара У.Пічэты апрацавала ў Маскве статут Інбелкульту па тыпу даследчых інстытутаў. Каб не адчыняць двух навуковых інстытуцый, якія маглі весці паралельную працу, прыйшлося гэтыя праекты пагадзіць і апрацаваць адзін статут, які ў аснове сваёй захаваў абодва прынцыпы — і навукова-даследчай установы і культурна-грамадзянскай...*

*Хроніка Беларускага Культурнага жыцця // Адраджэнне. — 1922. — Сшытак I. — С. 279.*

*Комиссией по организации Инбелкульта закончен разработкой устав Института... Личный состав будет складываться из действительных членов, научных сотрудников и членов-корреспондентов. В действительные члены будут привлекаться авторитетные учёные силы: на их обязанности будет лежать ведение самостоятельных научных исследований, заведование отдельными кафедрами и научно-вспомогательными учреждениями, а также руководство научными занятиями научных сотрудников. Научные сотрудники будут избираться Учёным Советом Института из лиц, получивших законченное высшее образование и обнаруживших склонность к исследовательской работе в области белорусоведения...*

*Вестник Народного Комиссариата Просвещения. — 1921. — № 2. — С. 33—34.*

*Председателю Института Белорусской Культуры*

*Я очень тронут избранием меня в действительные члены Института Белорусской Культуры. Вся моя научная деятельность связана с изучением настоящего и прошлого Белоруссии; думаю, что и остаток моей жизни будет посвящён тому же.*

*Весьма прошу передать мой сердечный привет председателям научных белорусских институций и пожелания процветания новому учреждению.*

*Прошу принять уверение в моём к Вам уважении и преданности.*

*Академик Р.А.Н. Е.Карский*

*20/III.1922 г.*

Стварэнне Інбелкульта атрымала гарачую падтрымку навуковай грамадскасці. На адрас новага цэнтра прыйшлі віншаванні ад Расійскай акадэміі навук, Наркамасветы УССР і інш.

У 1922—1924 гг. Інбелкульт разгарнуў шматбаковую прадукцыйную дзейнасць, асабліва па распрацоўцы тэрміналогіі, складанні і выданні падручнікаў для школ. Праводзяцца экспедыцыі па вывучэнні прыродных багаццяў Беларусі. Характэрнай з'явай таго часу стала арганізацыя вакол Інбелкульта краязнаўчага руху. У 1924 г. пры інстытуце ствараецца Цэнтральнае бюро краязнаўства. Яго супрацоўнікі накіроўвалі дзейнасць краязнаўчых арганізацый на месцах, аказвалі ім усебаковую дапамогу. З кастрычніка ЦБК пачало выдаваць штомесячны часопіс "Наш край" (з лістапада 1930 г. "Савецкая Краіна"). Пашырыліся і ўмацаваліся сувязі беларускіх краязнаўцаў з калегамі ў Расіі, Украіне, Азербайджане, Грузіі, Узбекістане. Бюро абменьвалася выданнямі з замежнымі краязнаўчымі арганізацыямі — Варшавы, Лейпцыга і інш. Важнай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі з'явіўся I Усебеларускі краязнаўчы з'езд, які адбыўся ў Мінску (1926).

25 ліпеня 1924 г. ЦВК і СНК БССР зацвердзілі "Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры", якое юрыдычна замацавала яго ў статусе вышэйшай дзяржаўнай навуковай установы Беларусі. У сувязі з гэтым пашырыўся дыяпазон даследаванняў. Інбелкульт атрымаў права адкрываць музеі, бібліятэкі, архівы, склікаць навуковыя канферэнцыі, з'езды, наладжваць экспедыцыі. Напрыклад, толькі з яго дазволу маглі праводзіцца археалагічныя раскопкі. Была агаворана магчымасць бяспошліннага атрымання замежнай літаратуры, прылад для навуковых даследаванняў. Палажэнне вызначыла структуру, кіруючыя органы, формы навуковай дзейнасці. Работнікі навукі і культуры, якія мелі дачыненне да Інбелкульта, падзяляліся на правадзейных сапраўдных членаў, членаў-супрацоўнікаў і членаў-карэспандэнтаў. Агульная колькасць правадзейных членаў складала 56 чал. Старшынёй Інстытута беларускай культуры быў выбраны наркам асветы БССР У.Ігнатоўскі.

Наступны крок у рэфармаванні вядучага навуковага цэнтра вызначыла рашэнне ЦВК і СНК БССР (люты 1926 г.), згодна з якім Інбел-



*У.М.Ігнатоўскі*

культ быў вылучаны са складу Наркамасветы рэспублікі і рэарганізаваны ў Дзяржаўную навукова-даследчую ўстанову пры Савеце Народных Камісараў БССР. Старшыні Прэзідыума было дадзена права выходзіць непасрэдна на вышэйшы дырэктыўны орган з пытаннямі і прапановамі, што датычылі арганізацыі ў рэспубліцы навуковых даследаванняў. Гэта садзейнічала наладжванню больш цеснага і планамернага супрацоўніцтва з іншымі навуковымі ўстановамі і ВНУ, актуалізацыі навуковых распрацовак у вырашэнні народна-гаспадарчых праблем. Рос аўтарытэт інстытута. Усё больш выразна акрэсліваліся перспектывы стварэння на яго базе магутнай Акадэміі навук.

У гэты час у Інбелкульце працавалі наступныя секцыі: беларускай мовы і літаратуры (з камісіямі па рэформе правапісу), беларускага мастацтва (з падсекцыямі тэатральнай, музычнай, выяўленчага мастацтва), гісторыка-археалагічная (з 1927 г. сацыяльна-гістарычная), па вывучэнні рэвалюцыйнага руху ў Беларусі (з камісіяй па складанні біяграфічнага слоўніка рэвалюцыйных дзеячаў), прыродазнаўчая (з падсекцыямі геолага-глебазнаўчай, хіміі, фізікі, матэматыкі і метэаралогіі, заалагічнай, батанічнай, геаграфічнай), медыцынская, сельскагаспадарчая (з падсекцыямі лясной, хатніх рамёстваў, меліярацыі і камісіямі тэрміналагічнаи, папулярнаи сельскагаспадарчай літаратуры, сельскагаспадарчага раянавання), навуковай арганізацыі працы з псіхатэхнічнай лабараторыяй, а таксама навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры Беларускай сельгасакадэміі ў Горках.

У склад Інбелкульта ўваходзілі два нацыянальныя аддзелы — яўрэйскі і польскі. Тут працавалі самастойныя навуковыя камісіі: слоўнікавая, галоўная тэрміналагічная, літаратурная, гісторыка-археалагічная, па ахове помнікаў даўніны, мастацтва і прыроды, па вывучэнні натуральных вытворчых сіл, бібліяграфічная, а таксама Цэнтральнае бюро краязнаўства, хімічная лабараторыя, выдавецтва (з 1926 г.). Інстытуцкая бібліятэка, аснову якой складалі кнігі, падараваныя вучонымі, абменьвалася выданнямі з 100 бібліятэкамі Савецкага Саюза і 74 — замежных краін. Інбелкульт вёў вялікую папулярызатарскую работу. Пры ім быў адкрыты прыродазнаўчы музей з калекцыяй экспанатаў па геалогіі (да 300 узораў мясцовых парод і глебавых маналітаў), гербарыямі беларускай флоры (каля 1,2 тыс. відаў), заалагічнай калекцыяй (да 3,5 тыс. экз. птушак і 1,5 тыс. відаў беспазваночных).

З 1927 г. у структуры Інбелкульта адбыліся змены — яна прыбліжана да структуры Акадэміі навук. У чэрвені СНК БССР зацвердзіў новы статут, згодна з якім усе навуковыя ўстановы аб'ядноўваліся ў два аддзелы: прыроды і гаспадаркі і гуманітарных навук. Правадзейныя члены Інбелкульта з гэтага часу зацвярджаюцца Саветам Народных Камісараў. Ствараюцца 17 кафедраў, 41 камісія, 3 інстытуты, 3 лабараторыі і 3 музеі. Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю ўскладзена на Акадэмічны савет. Актывізацыі навуковых даследаванняў садзейнічаў і хуткі рост асігнаванняў: у 1927—1928 гг. яны перавысілі 385 тыс. рублёў.

Адначасова з стварэннем арганізацыйных асноў дзейнасці адбывалася фарміраванне новых кадраў. Першапачаткова гэтая праблема

*З пастановы СНК БССР ад 10 ліпеня 1926 г. «Аб Інстытуце беларускай культуры».*

*Заслухаўшы даклад Старшыні ІБК тав. У.М.Ігнатоўскага за прайшоўшы час, СНК БССР пастанаўляе: 1. Прызнать, што з моманту сваёй рэарганізацыі Інстытут Беларускай Культуры з поспехам выконвае ўскладзеную на яго задачу па ўдасканаленні навуковай і культурнай работы ў Беларусі, па даследаванні і вывучэнні эканамічных, прыродных і сацыяльна-гісторычных каштоўнасцей беларускага народа і ўсіх нацыянальных меншасцей, якія насяляюць Беларусь. У выніку гэтай работы адзначаецца ўзмацненне ўплыву ІБК на ўсю навукова-даследчую дзейнасць у рэспубліцы.*

*У сувязі з агульнадзяржаўным уздымам Беларусі ... лічыць необходным с 1926—27 акадэмічнага года даць ІБК напрамак да паступовага пераўтварэння яго ў Беларускую Акадэмію Навук.*

*Нам. старшыні СНК БССР М.Карклін*

*Управляючы справамі СНК і Эканамічнай Нарады БССР М.Мароз*

*ЗЗ БССР. 1926. № 29. Арт. 106*

*З Статута ІБК, зацверджанага СНК БССР 29 чэрвеня 1927 г.*
*...2. Інстытут Беларускай Культуры мае наступныя задачы:*
*а) распаўсюджанне і ўдакладненне навуковых дысцыплін, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю, узбагачаючы іх новымі адкрыццямі і метадамі даследавання;*
*б) планавае даследаванне Беларусі з боку яе прыродных вытворчых сіл, вывучэнне і садзейнічанне іх выкарыстанню, народнай гаспадаркі, права, грамадскага руху, мовы, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі і інш.;*
*в) об'яданне ў гэтых галінах усёй навуковай работы, якая вядзецца навуковымі ўстановамі БССР і асобнымі вучонымі;*
*г) прыстасаванне навуковых тэорый і вынікаў навуковых даследаванняў да практычнага прымянення ў прамысловасці і культурна-экономічным будаўніцтве БССР.*
*Старшыня СНК БССР — М.Галадзед*
*Упраўляючы справамі СНК і Эканамічнай Нарады БССР — М.Мароз*
*ЗЗ БССР. 1927. № 31. Арт.158.*

*Пастанова СНК БССР ад 3 лістапада 1927 г.*
*Аб зацвярджэнні правадзейных членаў Інстытута Беларускай Культуры*

*Савет Народных Комісараў БССР пастанаўляе: зацвердзіць правадзейнымі членамі Інстытута Беларускай Культуры У.М.Ігнатоўскага, С.М.Некрашэвіча, І.Ю.Лёсіка, А.І.Смоліча, І.І.Замоціна, А.М.Ясінскага, У.І.Пічэту, М.Ф.Бліядуху, Я.М.Афанасьева, У.У.Ластоўскага, І.Д.Луцэвіча (Я.Купалу), К.М.Міцкевіча (Я.Коласа), Дз.Ф.Жылуновіча, С.Ю.Матулайціса.*

*Старшыня СНК БССР — М.Голадзед*
*Упраўляючы справамі СНК і Эканамічнай Нарады БССР — М.Мароз*
*Збор законаў БССР. 1927. № 42. Арт. 226.*

*Пастанова СНК БССР ад 3 лістапада 1927 г.*
*Аб складзе Прэзідыума Інстытута Беларускай Культуры:*
*СНК БССР пастанаўляе зацвердзіць наступны склад Прэзідыума Інстытута Беларускай Культуры:*
*1. Прафесар Ігнатоўскі У.М., Прэзідэнт Інстытута Беларускай Культуры; 2. Бялуга М.І., Віцэ-Прэзідэнт ІБК; 3. Ластоўскі У.У. Неадменны Сакратар ІБК; 4. Некрашэвіч С.М., Старшыня Аддзела Гуманітарных Навук ІБК; 5. Смоліч А.І., Старшыня Аддзела Прыроды і гаспадаркі ІБК; 6. Гельтман С.Л., Загадчык Польскага сектара ІБК; 7. Аршанскі Б.М., Загадчык Яўрэйскага Сектара ІБК.*
*Старшыня СНК БССР — М.Голадзед*
*Упраўляючы справамі СНК і Эканамічнай Нарады БССР — М.Мароз*
*ЗЗ БССР. 1927. № 42. Арт. 225.*

вырашалася шляхам запрашэння кваліфікаваных спецыялістаў з вядучых навуковых цэнтраў Расіі, Украіны (І.Замоцін, М.Нікольскі, У.Перцаў, У.Пічэта, М.Шчакаціхін, М.Доўнар-Запольскі і інш.). З-за мяжы ў 20-ых гг. вярнуліся многія работнікі навукі і культуры. Сярод іх — М.Гарэцкі, Ф.Аляхновіч, А.Смоліч, А.Цвікевіч, У.Ластоўскі, Б.Эпімах-Шыпіла, якія адыгралі адметную ролю ў нацыянальным адраджэнні і дзейнасці Інбелкульта. Агульная колькасць супрацоўнікаў (па даных на ліпень 1927 г.) склала 176 чал.: 76 правадзейных членаў, 65 членаў-супрацоўнікаў і 35 членаў-карэспандэнтаў. Больш за палову іх з'яўляліся прадстаўнікамі беларускай нацыянальнасці, выхадцамі з сялян, рабочых і служачых. З 93 абследаваных у тым годзе членаў Інбелкульта універсітэцкую адукацыю мелі 41 чал., політэхнічную — 2, агранамічную — 13, педагагічную — 6, ветэрынарную — 2, спецыяльную — 5, сярэднюю — 14; 5 чал. былі з самаадукацыяй, столькі ж не далі звестак. У справаздачы адзначалася, што "вельмі значны працэнт членаў Інбелкульта, як правадзейных, так і супрацоўнікаў, атрымалі вышэйшую і сярэднюю адукацыю за ўласныя сродкі. Гэта значыць, без дапамогі бацькоў, выбіваючыся звычайна з беднай сялянска-рабочай сям'і"*. З 1927 г. пачалася падрыхтоўка новых навуковых кадраў праз аспірантуру.

Сярод правадзейных членаў адзначым выдатных вучоных, пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў І.Луцэвіча (Я.Купалу), К.Міцкевіча (Я.Коласа), Дз.Жылуновіча (Ц.Гартнага), М.Гарэцкага, М.Кудзельку (М.Чарота), А.Кірсанава, С.Вальфсона, І.Пятровіча, Г.Гарэцкага, В.Лявоо-

* Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. — ф. 67, воп. 1, с. 24, арк. 109.

нава, І.Цітова. У ліку членаў-супрацоўнікаў былі вядомыя ў далейшым дзеячы навукі і культуры К.Атраховіч (К.Крапіва), П.Рагавы, А.Фядзюшын.

Значны ўрон інтэлектуальнаму патэнцыялу краіны нанеслі палітычныя рэпрэсіі. З 15 праўдзейных членаў Інбелкульта, выбраных у 1927 г., былі рэпрэсіраваны 8 (Я.Афанасьеў, М.Дурнаво, Дз.Жылуновіч, І.Замоцін, У.Ластоўскі, І.Лёсік, С.Матулайціс, А.Смоліч), арыштоўваўся У.Пічэта. З 104 штатных супрацоўнікаў спісачнага саставу 1928 г. былі арыштаваны і рэпрэсіраваны 48 чал. Трагічна склаўся лёс першага старшыні Інбелкульта вядомага мовазнаўцы С.Некрашэвіча: яго расстралялі ў 1937 г. У 1931 г. скончыў жыццё самагубствам У.Ігнатоўскі.



Будынак Акадэміі навук БССР. 1932 год

Наяўнасць значнай па тым часе колькасці навуковых кадраў Інбелкульта дазволіла весці навукова-даследчыя работы па шэрагу актуальных праблем. У галіне мовазнаўства на першым плане было складанне тэрміналагічных слоўнікаў. У кожнай секцыі інстытута працавалі тэрміналагічныя камісіі. Вынікам іх дзейнасці з'явілася стварэнне і выданне спецыяльных слоўнікаў беларускай тэрміналогіі па 24 галінах ведаў — матэматычнай, фізічнай, геалагічнай, батанічнай і г.д.

Гэтым быў пакладзены пачатак шырокаму ўсебаковаму вывучэнню роднай мовы. Супрацоўнікі Камісіі па рэформе беларускай мовы да канца 1926 г. стварылі картатэку на 180 тыс. слоў. М.Байкоў і С.Некрашэвіч падрыхтавалі і выдалі "Беларуска-рускі слоўнік" (1925) і "Руска-беларускі слоўнік" (1928). Расшырэнне даследаванняў прывяло да стварэння слоўнікаў, якія ўвайшлі ў беларускую лексікаграфію пад назвай краявых (напрыклад, "Віцебскі краявы слоўнік", 1927). Распрацоўваліся пытанні гісторыі беларускай мовы (П.Бузук, І.Воўк-Леановіч). У развіцці айчыннага літаратуразнаўства 20-ых гг. значную ролю адыгралі А.Бабека, У.Дубоўка, І.Замоцін, А.Вазнясенскі, Я.Барычэўскі, М.Піятуховіч. Выступленні ў перыядычным друку Я.Купалы, Я.Коласа, М.Гарэцкага, К.Крапівы і іншых пісьменнікаў з аналізам развіцця беларускай літаратуры мелі вялікае значэнне ў станаўленні літаратурнай крытыкі.



Акадэмік АН БССР
У.І.Пічэта

У галіне гісторыі і археалогіі плённа працавалі М.Доўнар-Запольскі, Д.Даўгяла, А.Ляўданскі, К.Палікарповіч. Работа вялася ў цесным кантакце з вучонымі Масквы, Ленінграда, іншых навуковых цэнтраў СССР. Экспедыцыі, раскопкі дазволілі ў агульных рысах вызначыць асаблівасці культуры плямён, якія некалі жылі на тэрыторыі Беларусі. Шмат рабілася па ахове гістарычных помнікаў. Вядомымі этнографамі ў той час былі А.Сержпутоўскі, І.Сербаў, М.Мялешка. Краязнаўцы шырока разгарнулі музейную працу. У 1927 г. у рэспубліцы было 18 музеяў, у экспазіцыі якіх значнае месца займалі прадметы быту.

Адно з галоўных месцаў у дзейнасці Інбелкульта адводзілася вывучэнню прыроды. У кантакце з Дзяржпланам БССР плённа працавала камісія па вывучэнні натуральна-вытворчых сіл. Асабліва варта адзначыць дзейнасць Б.Тарлецкага, які з лета 1923 г. па даручэнні Дзяржплана вывучаў карысныя выкапні ў раёнах, прылеглых да Мінска, Чэрвеня, Бабруйска. Былі вызначаны запасы мелу і даследаваны пяскі для вытворчасці шкла ў раёне Дзяржынска. Пачалася падрыхтоўчая работа да складання геалагічнай карты БССР. У 1927 г. ствараецца Інстытут геалагічных навук, супрацоўнікі якога працягвалі такую дзейнасць. Выдатнымі вучонымі-геолагамі з'явіліся П.Туткоўскі, М.Бліядуха, Ф.Лунгерсгаузен. Сярод геабатанічных даследаванняў значнае месца занялі працы

*«У 1928—1929 акадэмічны год ІБК увайшоў як моцная навукова-даследчая ўстанова... У мэтах выкарыстання навуковых дасягненняў для сацыялістычнага будаўніцтва ІБК раздвінуў шырокую працу ў вывучэнні Беларускай культуры і культуры іншых нацыянальнасцяў БССР. У ІБК згрунтаваліся лепшыя навуковыя сілы і ён пачаў абрастаць кадрамі маладых даследчыкаў. Сувязь ІБК з шырокімі працоўнымі масамі Беларусі ўзмацнілася. Наладзіліся навуковыя сувязі ІБК з навуковымі ўстановамі СССР і замежных краін. Усё гэта прывяло як партыйную, так і беспартыйную грамадскасць да прызнаньня своечасовасці рэарганізацыі ІБК у Беларускую Акадэмію Навук...»*

*У.Ігнатоўскі. Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР // Бальшавік Беларусі. — 1928. — № 12.— С. 25.*

Г.Высоцкага па дэндралогіі, С.Георгіеўскага па біялогіі лясных парод, У.Касаткіна па флоры лугоў і балот, М.Гайдукова па водарасцях, А.Фядзюшына па фауне. У перыяд з 1923 па 1928 г. біёлагамі А.Палянскім і В.Савічам арганізаваны некалькі геабатанічных экспедыцый з мэтай даследавання тэрыторыі Беларусі (у выніку складзена геабатанічная карта рэспублікі).



***Прэзідэнт АН БССР (1952—1966 гг.) Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР Б.Ф.Купрэвіч***

Вялікая ўвага надавалася пытанням аховы здароўя. Медыцынская секцыя, арганізаваная ў красавіку 1924 г., была адной з самых шматлікіх — каля 70 чал. У яе ўваходзілі М.Барсукоў, М.Кроль, З.Магілеўчык, С.Рубашоў і інш. Вывучаліся такія праблемы, як санітарныя ўмовы жылля і быту, дзіцячая смяротнасць, адкрытыя лячэбныя крыніцы і г.д.

Аграрныя пытанні найбольш вынікова даследавалі Я.Афанасьеў, С.Скандракоў, Г.Гарэцкі, М.Ганчарык, П.Рагавы, О.Кедраў-Зіхман, якія сваімі працамі заклалі асновы глебазнаўства ў Беларусі.

Да канца 20-ых гг. вучоныя Інбелкульта стварылі сур'ёзныя задзелы ў галіне гуманітарных і прыродазнаўчых навук. Іх даследаванні садзейнічалі аднаўленню і развіццю народнай гаспадаркі. Фарміравалася айчынная навуковая інтэлігенцыя, былі дасягнуты значныя поспехі ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (у 4 ВНУ навучалася каля 5 тыс. студэнтаў). Вырасла сетка навукова-даследчых устаноў: працавалі 10 НДІ (6 з іх медыцынскага профілю), 7 доследных сельскагаспадарчых станцый. Інстытут беларускай культуры паспяхова вырашаў ускладзеныя на яго задачы і ўшчыльную падышоў да рэарганізацыі ў Беларускую акадэмію навук, што і адбылося ў канцы 1928 г.



***Прэзідэнт АН БССР (1969—1987 гг.) Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР М.А.Барысевіч***

Сёння Беларусь валодае развітой навукова-арганізацыйнай структурай, якую складаюць буйныя акадэмічныя комплексы, унітарныя навукова-даследчыя прадпрыемствы, магутныя універсітэты. Дасягненні нашых вучоных добра вядомы не толькі ў краінах СНД, але і ва ўсім свеце. У ходзе далейшага развіцця навукі, вядома ж, будуць узяты новыя вышыні. І заўсёды іх узровень будзе суадносіцца з тым, што было раней, на папярэдніх этапах, ля вытокаў. З памяці ўдзячных патомкаў не сатруцца імёны першапраходцаў беларускай навукі, якія самаахвярна працавалі на карысць Айчыны. І, успамінаючы іх, мы будзем зноў і зноў узгадваць дзейнасць Інстытута беларускай культуры — першага ў нашай дзяржаве цэнтра навуковай думкі.